# Тайна, якая вырастае з-пад зямлі

**За апошняе дзесяцігоддзе перыядычны друк, тэлебачанне і асабліва інтэрнэт-прастора добра-такі ўсцешылі нас паведамленнямі пра разнастайныя загадкавыя з'явы, што не-не ды праяўляліся на беларускіх абсягах: то падчас даследавання сярэднявечных замкавых муроў на Гродзеншчыне ў сталічных вучоных пераставала працаваць электронная апаратура, то ў адным з райцэнтраў Міншчыны адшукаўся даўні магільны склеп – зменшаная копія славутых егіпецкіх пірамід, то дзесьці на Віцебшчыне знайшліся рэшткі старажытнай астранамічнай абсерваторыі…**
**Аднак найчасцей такія звесткі тычыліся менавіта каменных крыжоў, якія, нібы тыя грыбы, падрасталі з зямлі, – іх з'яўленне было заўважана ў самых розных рэгіёнах нашай краіны. Пры гэтым, мяркуючы па публікацыях, большасць гэтых «нараджэнцаў» надзелены ўласцівасцямі, здольнымі аказваць пазітыўнае ўздзеянне на настрой і самаадчуванне чалавека. Менавіта таму рэдакцыя «Беларускай думкі» вырашыла выпрабаваць на сабе цудадзейную сілу тых каменных крыжоў, дзеля чаго мы і выправіліся ў вандроўку па так званых загадкавых мясцінах Беларусі.**

Праўда, на пачатку з вызначэннем яе маршруту давялося крыху павагацца, бо надта ж шмат знайшлося на карце нашай краіны месц, дзе можна напаткаць выраблены з каменю крыжы. І такая шырокая распаўсюджанасць найперш вынікае з іх функцыянальнага прызначэння – адны крыжы ўстанаўліваліся нашымі продкамі як пазнакі на скрыжаванні дарог, каля пераправаў праз рэкі, на межах зямельных надзелаў альбо на месцах памятных падзей, іншыя ж служылі абярэгам паселішчаў ад эпідэмій і ворагаў. Акрамя гэтага, каменныя крыжы сёння можна яшчэ напаткаць каля старажытных курганоў, на замчышчах, на царкоўных і касцельных цвінтарах. Але найчасцей іх пабачыш на старых вясковых могілках. Пры гэтым далёка не ўсе яны падрастаюць з зямлі і, больш таго, не за кожным з іх народны розгалас замацаваў праявы цудадзейства

Помнік у гонар першага ўпамінання Турава ў летапісных крыніцах (980 год)



Тым не менш нам удалося пазначыць у сваім дарожным нататніку добры дзясятак цікавых, на наш погляд, адрасоў…

## УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У ТУРАЎ

Шчыра кажучы, сённяшні воблік старажытнага Турава не вызначаецца асаблівым багаццем старадаўніх архітэктурных форм. З усіх тамтэйшых пабудоў сваёй 200-гадовай даўніной вылучаецца хіба што драўляная Усіхсвяцкая царква. А між тым у гісторыі гэтага горада, які, паводле згадкі ў «Аповесці мінулых гадоў», пачынае свой адлік ад 980 года, быў час – XII–XIII стагоддзі, калі прывабнасць і велічную красу яго вонкаваму абліччу надавалі замак, адметная абарончая вежа і ажно некалькі дзясяткаў праваслаўных храмаў. Аднак гістарычныя перыпетыі і найперш шматлікія войны, якія не абміналі горад, не пашкадавалі старадаўніх святынь. Зараз пра тую ўнікальную пару – перыяд асаблівага росквіту Турава і яго ваколіц – нагадваюць толькі выяўленыя роўна паўстагоддзя таму археолагамі і адносна нядаўна прадбачліва ўзятыя пад схрон спецыяльна ўзведзеным шкляным саркафагам падмуркі ці не самай старадаўняй тураўскай царквы, збудаванай яшчэ ў 1170-я гады, але разбуранай, паводле адной з версій, землятрусам 3 мая 1230 года. Пра былую веліч заснаванага на прыпяцкім узбярэжжы горада сёння яскрава сведчаць разам з багатымі гістарычнымі матэрыяламі мясцовага краязнаўчага музея і народжаныя ўжо нашым часам помнікі колішнім выбітным тураўчанам – знакамітаму асветніку Старажытнай Русі Кірылу Тураўскаму

і апекуну праваслаўя князю Канстанціну Астрожскаму.

Усе гэтыя славутасці, як і размешчаны там жа музей прыроды Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», безумоўна ж, зававліваюць сёння ў Тураў шматлікіх турыстаў. Аднак ёсць у гэтага горада і яшчэ адна адметнасць, якая спадахвочвае прыязджаць сюды людзей з самых розных мясцін Беларусі і нават з-за яе межаў. І гэта – нішто іншае, як тыя самыя загадкавыя каменныя крыжы, што растуць з зямлі. У Тураве пра іх ведае кожны, таму для заезджага чалавека тут не існуе так званай пошукавай праблемы: вам ахвотна падкажуць шлях за горад, на Барысаглебскія могілкі.

Месца вечнага спачыну тураўчан, паводле сцверджання захавальніка фондаў Тураўскага краязнаўчага музея Сяргея Мароза, які спадахвоціўся правесці для нас экскурсію па гістарычных славутасцях свайго горада, толькі на першы погляд нічым не адрозніваецца ад соцень іншых беларускіх могілак. На самай жа справе тураўскія могілкі маюць даволі даўнюю гісторыю. Сваю назву яны атрымалі ад заснаванага яшчэ ў XII стагоддзі Барысаглебскага манастыра. Яго пабудавалі ў гонар першых праваслаўных святых Кіеўскай Русі – Барыса Растоўскага і Глеба Мурамскага, сыноў кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча, якія былі забіты падчас міжусобнай барацьбы за ўладу іх старэйшым братам Святаполкам. Лічыцца, што менавіта ў сценах гэтага храма за вывучэннем свяшчэнных тэкстаў і напісаннем казанняў і спавядальных малітваў правёў чатыры гады свайго пустэльніцтва сярэдневяковы свяціцель і асветнік сучаснай зямлі беларускай Кірыла Тураўскі. Але асноўнай адметнасцю колішняга манастырскага цвінтара, вядома ж, з'яўляюцца каменныя крыжы, якія штогод падрастаюць тут з зямлі на некалькі сантыметраў. Прычым не толькі ў вышыню, але і ўшыркі.



Каменны крыж, які расце з зямлі на Барысаглебскіх могілках г. Турава

Хто першы запрыкмеціў на тураўскіх могілках камень, які пачаў вылазіць з зямлі, па сённяшні дзень застаецца загадкай. Як расказаў нам С. Мароз, гэта адбылося недзе ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Але толькі пасля таго, як у яго з бакоў з'явіліся крылы – папярэчныя перакладзіны, стала зразумела, што на свет з-пад зямлі прабіваецца менавіта каменны крыж. Тады хтосьці са старажылаў і згадаў пра пачутыя ад сваіх дзядоў яшчэ ў дзяцінстве легенды.

Паводле адной з іх, з'яўленне каменнага крыжа звязана з імем манаха Барысаглебскага манастыра святога Марціна. Ён доўгі час служыў у тураўскіх епіскапаў кухарам, але пад старасць моцна захварэў. Боль быў нясцерпны, і калі Марцін, лежачы ў сваёй келлі, маліўся і выпрошваў у Бога смерці, да яго з'явіліся святыя Барыс і Глеб. Яны накармілі старога хлебам і напаілі вадой, якую зачэрпалі з калодзежа, у свой час выкапанага самім жа Марцінам на ўскрайку манастырскага цвінтара. І пасля гэтага адбыўся цуд – хворы кухар выздаравеў, а вада ў калодзежы, якая да гэтага была нясмачнай і жоўтай, бо навокал было балота, стала празрыстай і гаючай. Менавіта гэтай вадою пасля свайго вылечвання і стаў Марцін лекаваць людзей, якія прыходзілі да яго як з самога Турава, так і з наваколля з просьбай аб паратунаку ад хвароб і пошасцей.

Незадоўга да сваёй смерці Марцін-празорлівец нібыта гаварыў тураўчанам: «І магілу маю згубіце, але я праз стагоддзі пакажу, дзе ляжу, і служыць вам буду...» І вось толькі цяпер тое, што прадракаў стары манах, пачало збывацца. Калі верыць легендзе, каменны крыж, які расце на Барысаглебскіх могілках у Тураве, акурат падказвае тое месца, дзе пахаваны святы Марцін.

Паводле іншага падання, на гэтых жа самых могілках пасля сканчэння свайго зямнога шляху быў пахаваны і Кірыла Тураўскі. І нібыта, развітваючыся з манахамі перад смерцю, ён таксама даў ім свой наказ: «Вярнуся, калі прыйдзе час...» І тое, што цяпер крыж расце,

прынята звязваць менавіта з прароцтвам знакамітага нашага асветніка і царкоўнага дзеяча. Маўляў, якраз настаў час для вяртання да нас Кірылы Тураўскага, бо пасля працяглага занепаду, выкліканага перыядам савецкага ваяўнічага атэізму, праваслаўная царква ў Беларусі пачала адраджацца і зноў набывае ранейшую вагу ў грамадстве.

Дарэчы, у сувязі з гэтым цікавым падаецца і такі факт – сучасны помнік Кірылу Тураўскаму, аўтар якога беларускі скульптар Міхаіл Інькоў, паўстаў на Замкавай гары ў Тураве акурат у 1994 годзе. А гэта, як памятаем, прыкладна той самы час, калі ўпершыню абазначыў сябе на Барысаглебскіх могілках каменны крыж.

Між тым містыка на гэтым не заканчваецца. Нібы ў пацвярджэнне праўдзівасці абодвух народных паданняў, звязаных з паходжаннем тураўскага крыжа, некалькі гадоў таму на ўсё тых жа Барысаглебскіх могілках прарос і яшчэ адзін, пакуль меншы па памерах, каменны крыжык. І пасля гэтага ўжо не-не ды і пачынаеш міжволі верыць у збыццё прароцтваў і Кірылы Тураўскага, які, дарэчы, з'яўляецца нябесным ахоўнікам горада і ўсяго Беларускага Палесся, і святога Марціна.

## ВЫПРАБАВАНА НА САБЕ

Аднак не толькі арыгінальнасцю легенд прыцягваюць да сябе ўвагу нашых сучаснікаў тураўскія каменныя крыжы. Куды большы розгалас яны маюць з-за свайго цудадзейства.

– Людзі прыходзяць да крыжоў з надзеяй пазбавіцца ад хвароб і атрымаць дапамогу ў сваіх справах, – гаворыць староста тураўскай царквы Усіх Святых Валерый Катлярчук. – І яны многім спрыяюць. Асабіста я сачу за гэтым працэсам дзесьці з 1997 года. І не паверыце, колькі цудаў тут ужо адбылося за гэты час: у сем'ях, дзе доўга не было дзяцей, нараджаліся немаўляты, станавіліся здаровымі хворыя, якія доўга не маглі вылечыцца, а дзяўчаты, якія марылі сустрэць каханне, знаходзілі свае палавінкі…

А летась я ўбачыў ля крыжа сям'ю з Масквы, якая прыязджала сюды год таму. На гэты раз яны завіталі да нас, каб



А гэты крыж прабіўся з зямлі на Барысаглебскіх могілках у Тураве ўсяго некалькі год таму

выказаць падзяку за выздараўленне сына – 15 гадоў іх хлопчык не мог пазбавіцца энурэзу. А пасля таго, як ён пабываў каля крыжа і ў малітвах папрасіў у яго дапамогі, хвароба сама па сабе знікла.

Валерыю цяжка растлумачыць гэтыя цуды. Аднак у адным ён цвёрда перакананы – тураўскія каменныя крыжы валодаюць вялікай духоўнай сілай. Ды такой, што не толькі прыцягваюць людзей да сябе, але могуць і адштурхнуць.

– Кожны атрымлівае тут тое, з чым сюды прыйшоў, – лічыць ён. – Калі чалавек жыве ў граху, то наўрад ці ён можа разлічваць на дапамогу. Некаторыя мне ўжо пры выхадзе з могілак па сакрэту прызнаваліся, што не маглі прыкласці далоні да крыжа, таму што іх біла токам. Здараліся выпадкі, калі чалавек набліжаўся да крыжа і тут жа пачынаў выкрыкваць жывёльныя гукі. Але часцей людзі, якія дакранаюцца да нашай каменнай святыні, адчуваюць у сваіх далонях яе цеплыню. Было і такое, што ў адну з апошніх сцюдзёных зімаў крыж пачынаў вылучаць такую цеплыню, што вакол яго раставаў снег на добрага паўметра ў радыусе.

Зразумела, што пасля такога паведамлення мала хто змог бы ўтрымацца, каб не паспытаць на сабе цудадзейнае ўздзеянне каменнага крыжа. Адважыліся на гэта і мы. Але, прызнаемся шчыра, чаканага эфекту не атрымалі. Аднак і не страцілі канчатковай веры ў цуд. Здавалася б, настылы на

марозным паветры крыж павінен быў адштурхнуць ад сябе далонь халадам, але гэтага не адбылося. На здзіўленне, яго паверхня аказалася ўмерана прахалоднай і зусім не адпужвала. А пакідалі мы тураўскія могілкі са светлым пачуццём у душы...

Завесай таямнічасці ахутаны і яшчэ два тураўскія каменныя крыжы, якія сёння захоўваюцца ў мясцовай Усіхсвяцкай царкве. З гістарычных крыніц вядома, што некалі ў Тураве і яго наваколлі – вёсках Верасніцына, Пагост, Перароў, Хлупін, Старажоўцы і некаторых іншых – стаяла больш за дзесяць вялікіх каменных крыжоў, датаваных XII стагоддзем. У ранейшыя часы на іх ушанаванне збіраліся людзі ці не з усяго Прыпяцкага краю. Яны ўпрыгожвалі свае каменныя святыні стужкамі і лампадкамі, накрывалі хусткамі, клалі да іх падножжа манеты, сувоі палатна, рыбу, мяса і інш., хадзілі да іх хрэсным ходам. Лічылася, што тыя крыжы цудадзейныя і таксама дапамагаюць вылечыцца ад розных хвароб, спрыяюць жыццёваму дабрабыту, ладу ў сям'і. Згодна з паданнямі, яны самі прыплылі на Тураўшчыну з Кіева па Прыпяці супраць цячэння падчас хрышчэння Русі. Калі людзі заўважылі іх і вынеслі на бераг, то «...уся вада зрабілася крывёю», і гэта нібыта быў для тураўцаў яскравы знак на прыняцце новай веры.

Пасля гэтага жыхары Тураўшчыны на працягу яшчэ не аднаго стагоддзя спраўна абагаўлялі свае каменныя крыжы, звярталіся да іх па дапамогу. Аднак настаў савецкі атэістычны час і святыні сталі па-за законам, як і ўсё, што было звязана з рэлігіяй і царквой, многія з іх падпалі пад знішчэнне. У Тураве і сёння вам раскажуць гісторыю, як у 1930-я гады праводзілася змаганне з мясцовымі каменнымі крыжамі: тамтэйшыя актывісты ўкінулі іх у раку. Аднак праз некаторы час крыжы ўсплылі, і рыбакі падчапілі іх і вярнулі на бераг. Тады змагары з рэлігіяй паспрабавалі іх наогул знішчыць, пабіць на кавалкі, але зрабіць гэта ім так і не ўдалося – моц каменя ўзяла верх над неймавернымі стараннямі бязверцаў. У рэшце рэшт такое змаганне ім надакучыла, і крыжы закінулі



Адзін з двух каменных крыжоў, якія захоўваюцца ў тураўскай царкве Усіх Святых

далей ад староннягa вока. Калі ж атэістычнае ліхалецце мінула, двухмятровыя каменныя крыжы перанеслі ў тураўскую царкву Усіх Святых, і іх зноў сталі ўшаноўваць вернікі. Асабліва шмат людзей прыходзіць у гэты храм на Узвіжанне, калі каля крыжоў адбываюцца ўрачыстыя набажэнствы.

## ЦУДАЎ МНОГА НЕ БЫВАЕ

Прыклад тураўскіх каменных крыжоў далёка не адзіны. Як ужо згадвалася, іх сабраты выяўлены ў многіх рэгіёнах нашай краіны. Так, на суседняй з Тураўшчынай Століншчыне растуць з зямлі адразу некалькі каменных крыжоў – два ў вёсцы Вялікія Арлы, па аднаму ў Кароцічах і Хотамелі. Ім мясцовыя жыхары таксама прыпісваюць цудадзейную сілу. Дарэчы, апошні быў выяўлены яшчэ ў 1933 годзе. Вёска Хотамель тады знаходзілася на заходнебеларускай тэрыторыі ў складзе Польшчы. Сюды завітаў журналіст адной з варшаўскіх газет з мэтай праверыць факт загадкавага прасвятлення мясцовай невідушчай сялянкі – ёй прысніўся крыж, які рос з зямлі на могілках, назаўтра жанчына адшукала яго і тут жа выздаравела. Па просьбе польскага госця быў зроблены замер выяўленага каменнага крыжа. Яго вышыня ў той час складала каля 15 сантыметраў, а на сённяшні дзень хотамельскі крыж падрос ужо да 80 см.

Гадоў з пяць таму адразу некалькі растучых з зямлі каменных крыжоў былі адшуканы мясцовымі краязнаўцамі пад гарой смецця на старых могілках вёскі Заронава Віцебскага раёна. Паступова прабівае сабе дарогу з-пад зямлі і крыж каля вёскі Вялікія Шылавічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. Тое ж можна сказаць і пра каменныя крыжы, якія знаходзяцца на Міншчыне побач з вёскамі Драчкава і Грыцкавічы адпаведна Смалявіцкага і Крупскага раёнаў, у вёсцы Данілевічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці і Зубкі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

І гэта, трэба думаць, далёка не ўсе адрасы, выправіўшыся па якіх, можна спрычыніцца да цудадзейства каменных крыжоў, што растуць з зямлі. Проста ў многіх мясцовасцях працэс іх росту праходзіць альбо не заўважна для жыха-

роў, альбо яму не надаецца такой вялікай увагі і шырокай агалоскі, як, скажам, у выпадку з легендарнымі тураўскімі крыжамі. У гэтым была магчымасць пераканацца асабіста ў вёсцы Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

У цэнтры гэтага багатага на сваё гістарычнае мінулае паселішча на ўзвышшы красуецца мураваная Святапакроўская царква – асноўнае мясцовае архітэктурнае ўпрыгажэнне. Яе ўзвялі ў 1888 годзе на месцы ранейшай драўлянай спачатку ўніяцкай, затым пераасвячонай у праваслаўную святыні, якая была закладзена амаль на паўтара стагоддзя раней тагачаснымі ўладальнікамі вёскі Турэц Хадкевічамі. Як расказвае цяперашні настаяцель Святапакроўскай царквы айцец Аляксандр, і ў час існавання ў Турцы папярэдняга храма, і, напэўна, раней на сённяшнім цвінтары праводзіліся пахаванні. Адгалоскам тых часоў зараз з'яўляюцца два невялікія каменныя крыжы (адзін большы па памерах, другі нязначна ўзвышаецца над зямлёй), якія паволі растуць непадалёк ад царквы. Як сцвярджае святар, ніхто ў вёсцы асаблівай увагі на іх не звяртае – адзінока стаяць яны сабе на заходнім ускрайку цвінтара і не больш таго. Якой-небудзь легенды, звязанай з іх паходжаннем, айцец Аляксандр не ведае, маўчыць пра гэта і царкоўны летапіс, які вядзецца ад часу заснавання храма. Нічога канкрэтнага пра мясцовыя крыжы я не змог даведацца і ў сталага веку жыхароў Турца, якія мне сустрэліся на вуліцы.

...Што ж тычыцца феномена іншых цудадзейных тураўскіх каменных крыжоў, пра якія мы вялі гаворку вышэй і якія захоўваюцца ў тамтэйшай Усіхсвяцкай царкве, то і яму можна знайсці прадаўжэнне ў самых розных месцах. Так, напрыклад, на той самай Тураўшчыне ў вёсцы Пагост крыж месціцца ў невялікай царкве, што знаходзіцца на могілках, і мае назву «Святы крыж». У адрозненне ад сваіх тураўскіх «братоў» ён абвешаны фартушкамі, стужкамі, палотнамі, аздоблены кветкамі. Каля яго заўсёды можна знайсці маленькі ножык, якім мясцовыя вернікі і ўсе жадаючыя саскрабаюць з паверхні крыжа пясчынкі, што затым ужываюцца як лекі.

Каменныя крыжы, якія «паціху» падрастаюць у вёсцы Турэц Карэліцкага раёна



Жыхары вёскі Аздамічы Столінскага раёна Брэсцкай вобласці перакананы, што і мясцовы каменны крыж «вырас з-пад зямлі». У ранейшыя часы ён размяшчаўся пасярод капліцы, а ў 1980-я гады яго перанеслі і прымацавалі да сцяны скобамі. Да свайго каменнага крыжа аздамічане па-ранейшаму ставяцца з асаблівай увагай – вешаюць на яго спецыяльна пашытыя невялічкія фартушкі і хусткі, ручнікі, побач з ім кладуць кветкі. І пры гэтым шчыра спадзяюцца, што ён дапаможа пазбавіцца ад хвароб і ўшануе памяць памерлых продкаў.

У вёсцы Дарапеевічы Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці пра каменны крыж існуе паданне. Паводле яго, на вузкай грэблі сярод балота сустрэліся дзве вясельныя працэсіі. А паколькі, згодна з павер'ямі, маладым падчас перамяшчэння пакідаць вазок забаранялася, то іх кучары паспрабавалі раз'ехацца, не турбуючы жаніхоў і нявестаў. Але коні спужаліся, рванулі, і адна з вясельных брычак перакулілася, а маладых паглынула багна. Прайшоў час, і на месцы трагедыі з балота пачаў уздымацца ўзгорак, а потым на ім «вырас» і крыж. Лічыцца, што ён валодае асабліва чароўнай сілай і таксама дапамагае хворым вылечвацца.

У 1993 годзе на ўскрайку могілак вёскі Здудзічы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці таксама быў выяўлены каменны крыж вышынёй паўтара метра, выраблены з гранітнага валуна шэрага колеру. Тры гады таму яго перанеслі ў царкву Святой Марыі Магдаліны, што ў гарадскім пасёлку Парычы. Мясцовыя вернікі сцвярджаюць, што пасля адпаведнай просьбы-малітвы здудзіцкі каменны крыж садзейнічае ў лекаванні шматлікіх хвароб.

Такія прыклады, калі каменныя крыжы становяцца аб'ектам пакланення ў праваслаўных цэрквах, можна прыводзіць яшчэ шмат. Таму што гэта, зрэшты, як і знаходжанне ў некаторых беларускіх храмах цудадзейных камянёў, – даволі распаўсюджаная

з'ява, якая сведчыць пра трываласць сакральных традыцый нашага народа.

## СІЛА ВЕРЫ Ў КОЖНАГА СВАЯ

Наўрад ці варта аспрэчваць той факт, што ў пераважнай сваёй масе каменныя крыжы не толькі святыні, але і помнікі археалогіі, гісторыі, палеаграфіі, мастацтва і духоўнай культуры. Прычым яны маюць даволі шырокае бытаванне практычна па ўсёй Еўропе. Шмат каменных крыжоў, напрыклад, можна сустрэць у Чэхіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, на паўночным захадзе Расіі... Аднак, нягледзячы на тое, што ў савецкі перыяд беларускай гісторыі, падчас масавага змагання з рэлігіяй, шмат каменных крыжоў на тэрыторыі нашай краіны было проста знішчана, па іх агульнай колькасці, як пераканаНы вучоныя, сёння Беларусь усё адно абыходзіць усіх сваіх суседзяў.

Вышэй ужо згадвалася, што беларускія каменныя крыжы маглі мець самае рознае функцыянальнае прызначэнне. І кожны іх, так бы мовіць, від заслугоўвае, безумоўна ж, асаблівай журналісцкай увагі. Аднак мы наўмысна засяродзіліся толькі на найбольш загадкавых такіх святынях.

Праўда, з пункту гледжання навукоўцаў, ніякай загадкі ў тым, што каменныя крыжы вырастаюць з зямлі, няма. Тут спрацоўваюць элементарныя фізічныя законы, на падставе якіх, напрыклад, «вырастае» і звычайнае каменне на палетках: пасля дажджу глеба разбухае і ўздымаецца, а пры высыханні сціскаецца, у выніку такіх пульсацый камяні і «выходзяць» на паверхню. Росту каменных крыжоў садзейнічае і неаднаразовае замярзанне вады, што трапляе пад іх аснову праз глебу, а лёд, як вядома, пашыраецца і пры гэтым выштурхоўвае крыжы. Таксама з'яўленню на паверхні глебы камянёў і адпаведна выраблены з іх крыжоў спрыяе і неадчувальны і бяспечны для чалавека землятрус, які амаль штодня адбываецца на ўсёй планеце.

Таксама простая і разгадка паходжання каменных крыжоў. Гісторыкі сцвярджаюць, што многія з іх былі выраблены з каменных ідалаў, якім у паганскія часы пакланяліся нашы продкі. Прынамсі, вядомы факты, калі і пасля прыняцця хрысціянства людзі па-ранейшаму працягвалі ўшаноўваць сваіх каменных багоў. Святары ўсяляк змагаліся з гэтым – закопвалі, выкідвалі ў азёры і рэкі каменныя выявы, спрабавалі іх знішчаць. Аднак усе гэтыя захады давалі невялікі плён. Тады і было вырашана перашліфоўваць выраблены з каменю выявы паганскіх багоў у каменныя крыжы.




Сучасны гранітны крыж у гонар 1000-годдзя Тураўскай епархіі. Устаноўлены ў Тураве ў 2005 годзе

Але народная вера ў традыцыі продкаў была настолькі моцная, што паганскія абрады ўшанавання і ахвярапрынашэння аўтаматычна перайшлі і на каменныя сімвалы новай рэлігіі. Гэта найперш тычыцца так званых паклонных крыжоў, якія звычайна датуюцца XII–XIV стагоддзямі. Менавіта іх сталі ўпрыгожваць, да іх прыносілі рэчы і ежу, і пры гэтым не пераставалі верыць у цудадзейства сваіх новых каменных святынь.

Што ж да каменных крыжоў, якія растуць з зямлі, то ўжо з таго, што пераважна ўсе яны выяўлены на могілках, можна зрабіць выснову: гэта выраблены з каменю ў форме крыжа звычайныя пахавальныя помнікі. І, хутчэй за ўсё, іх ставілі на месцы пахавання найбольш шаноўных людзей альбо святароў...

Аднак фізіка-фізікай, дый гістарычныя факты няхай сабе застаюцца неабвержнымі, але куды больш арыгінальнымі і цікавымі, прынамсі, асабіста для нас, выглядаюць легенды і пра паходжанне каменных крыжоў, і пра іх цудадзейную сілу. А вось ужо верыць у іх ці не – прыватная справа кожнага.

**Сяргей ГАЛОЎКА**
**Фота аўтара**